Источник: **«Звязда» - 2013-02-19**

## Дзед Мароз і Умка пасяліліся ў Мінску

Сталічны батанічны сад у другі раз парадаваў мінчан і гасцей сталіцы фестывалем снежна-лядовых скульптур, які сёлета праходзіў у тэматыцы зімовай казкі. Менавіта таму большасць снежна-ледзяных персанажаў — героі казак розных краін. Аўтарамі 14 арыгінальных фігур сталі прафесійныя скульптары і студэнты.

У дзень урачыстага адкрыцця фестывалю наведнікі саду і журы фестывалю, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі арганізатараў, выбралі лепшыя ледзяную і снежную скульптуры. Пераможцай у намінацыі "Прыз глядацкіх сімпатый" стала скульптура "Тэтрыс" — яна ж, на думку журы, заняла першае месца сярод мастацкіх формаў з лёду. А сярод снежных скульптур лідарам па колькасці сабраных глядацкіх галасоў стала фігура "Залатая рыбка".

Пагуляць сярод зімовых шэдэўраў і сфатаграфавацца на іх фоне прыходзілі сем'ямі.

"Казачны сад" будзе радаваць мінчан і гасцей сталіцы, пакуль дазволяць умовы надвор'я.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

